*Пралетарская вул.* (г.п. Беш-чы), *Першамайскі завул.* (г.п. Беш-чы), *Першамайская вул.* (г.п. Беш-чы), *вул. Працы* (2), *вул. Свабоды* (г.п. Беш-чы), *Савецкая вул.* (3), *Савецкі завул.* (агр. Ула), *Ударная вул.* (г.п. Беш-чы). *Вул. Майская* (в. Сокарава) – віконім, матываваны, назвай месяца, таксама адносіцца да прынцыпу намінацыі аб'екта па сувязі з абстрактным паняццем.

**Заключэнне.** Такім чынам, унутрысельскія намінацыі Бешанковіччыны толькі напалову ўпісваюцца ў агульную віканімную сістэму Віцебшчыны: прынцып намінацыі аб'екта ў адносінах да іншага аб'екта знаходзіцца на другім месцы ў абодвух інвентарах; прынцып намінацыі аб'екта па яго ўласцівасцях і якасцях мае аднолькавы парытэт на абедзьвюх тэрыторыях – займае апошняе месца (Бешанковіччына – 12%, Віцебшчына – 7,4%). Арэалам найбольшай канцэнтрацыі віконімаў па прынцыпу намінацыі аб'екта па яго ўласцівасцях і якасцях з'яўляецца Віцебская вобласць – 49,5%. У той час, як дадзены прынцып з'яўляецца малапрадуктыўным на Бешанковіччыне – 12%. На даследаванай тэрыторыі найбольшую актыўнасць праяўляе прынцып намінацыі аб'екта па яго сувязі з чалавекам – 58%. Сярод намінацый, што адпавядаюць дадзенаму прынцыпу, найбольш пашыранай з'яўляецца група онімаў, якія абазначаюць назвы прафесій, сацыяльны стан, асоб, што маюць дачыненне да намінацыі таго ці іншага аб'екта. Найбольшай канцэнтрацыі дадзеныя онімы дасягаюць у г.п. Бешанковічы, які па сваіх намінацыйных асаблівасцях набліжаецца да ўнутрыгарадскіх.

1. Дорофеенко, М.Л. Виконимия Беларуси: номинативный, лингвогеографический, лингвокультурологический аспекты: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.02 – русский язык / М.Л. Дорофеенко. – Минск, 2015. – 28 с.

2. Мезенка, Г.М. Віцебшчына ў назвах вуліц: манаграфія: у 2 ч. / Г.М. Мезенка. – Віцебск: УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2008. – Ч.1. – 363 с.

3. Разумов, Р.В. Особенности современных российских систем виконимов (на примере Некоузского, Первомайского, Рыбинского, Тутаевского районов Ярославской области) / Р.В. Разумов // Яросл. пед. вестник. – 2013. – Т.1 (Гуманитарные науки). – №1. – С. 145 – 149

## ВОДНАЯ СТЫХІЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

***Кадукоў А.Ю.*,**

*студэнт ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік –* ***Падстаўленка В.Ф.*,** *канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Водная стыхія, ідэйна-мастацкая роля, мастацкая вобразнасць, эмацыйнасць, фальклорнасць, сімвалізм.

Keywords. Water element, ideological and artistic role, artistic imagery, emotionality, folklore, symbolism.

Многія беларускія аўтары ў сваіх творах звярталіся да разнастайных вобразаў воднай стыхіі: рэк, азёр, крыніц і г.д. Папулярнасць гэтых значных аб'ектаў прыродаапісальнай вобразнасці абумоўлена шэрагам пераканальных фактараў, актуальных як для агульнасветавай мастацкай традыцыі, так і для кожнага канкрэтнага творцы. Пры гэтым лепшыя айчынныя пісьменнікі мастацкаму адлюстраванню воднай стыхіі ўдала надавалі самабытнасць, а часам і глыбокі сімвалічны характар. Таму ў беларускім літаратуразнаўстве даўно наспела неабходнасць правесці цэласнае і канцэптуальна абаснаванае даследаванне вобразаў вады.

Мэта артыкула: выявіць сутнасць і спецыфіку вобразаў воднай стыхіі ў айчынных вершаваных творах.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з'яўляюцца вершаваныя творы са спадчыны Я. Коласа, Я. Купалы, П. Броўкі, М. Танка і інш., у якіх арыгінальна рэпрэзентуюцца водныя вобразы. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На розных этапах развіцця беларускай літаратуры айчынныя аўтары актыўна звярталіся да аквавобразаў. З імі мы звязаны не толькі ге-

аграфічна, але, па сваёй ідэйнай сутнасці, гэта істотная частка нацыянальнага культурнага свету.

Воднай стыхіяй шчыра захапляліся Я. Купала (у паэме “Магіла льва”, вершы “Рэчка”) [1], Я. Колас (у паэме “Новая зямля”, вершы “Ручэй”) [2], П. Броўка (у вершах “Вада”, “Крыніца”) [3] , М. Танк (у вершы “Люблю твае, Нарач, затокі і тоні”) [4], А. Пысін (у вершы “Проня”) [5] , А. Куляшоў (у вершы “Мая Бесядзь”) [6] і многія іншыя. Для гэтых майстроў слова вада з’яўляецца сапраўднай крыніцай натхнення, а водная стыхія – сімвалічнай прасторай, якая адкрыта перадае настроі і пачуцці лірычных герояў, асацыятыўна раскрывае пэўныя рысы іх характараў (напрыклад, сцішаную меланхалічнасць персанажаў ці іх шалёнае бунтарства), выконвае і прарочую (фаталістычную) функцыю для асобных персанажаў.

Ва ўсіх прыведзенных вышэй творах вада адыгрывае важныя ідэйна-мастацкія ролі. Напрыклад, у адзначаных вершаваных прыкладах са спадчыны беларускіх класікаў аквавобразы выходзяць шырэй за намінальныя прыродаапісальныя аб’екты, яны ўваходзяць у свет мілых успамінаў з дзяцінства, з’яўляюцца часткай малой радзімы аўтараў, а таксама глыбінным уласначалавечым складнікам. Усе беларускія паэты шчыра захапляліся воднай стыхіяй, яе неабмежаванасцю, вольнасцю, загадкавасцю, казачнасцю. Напрыклад, такім чынам раскрываецца цэнтральны вобраз у вершы “Ручэй” Я. Коласа:

Між алешын, кустоў,
Дзе пяе салавей,
І шуміць і грыміць
Срэбразвонны ручэй.
Як матулька, вярба
Хіліць голаў над ім,
І глядзяцца кусты
Пышным верхам сваім...

То заскочыць у гай,
То курган абаўе,
Дзе сярдзіта бубніць,
Дзе лагодна пяе [2, с. 209].

Як бачна з твора, вобраз ручая метафарызуецца, надзяляецца чалавечымі ўласцівасцямі.Такі мастацкі прыём бярэ свае выток і яшчэ з фальклору, але перманентна захоўвае сваю актуальнасць у нашых айчынных аўтараў. Так, у вершы Аляксея Пысіна “Проня” згаданая рэчка падаецца ў кранальным вобразе вольналюбівай дзяўчыны, якая не перад кім ніколі не скарыцца. Паэт удала спалучыў асноўныя якасці вады (яе чысціню, празрыстасць, непакорнасць) з адпаведным характарам гераіні верша, з яе самабытным бачаннем жыцця, самаўпэўненасцю і нязломнасцю.

**Заключэнне**. Такім чынам, пры аналізе беларускіх паэтычных прыкладаў мы акрэслілі сутнасць мастацкіх вобразаў воднай стыхіі. Пры дапамозе іх славутыя аўтары ярка і асацыятыўна адкрыта раскрывалі цэнтральных герояў і пэўны падзейны фон у творах, што ў значнай ступені спрыяла (і працягвае спрыяць) пазачасавай папулярнасці мастацкіх аквавобразаў.

1. Купала, Я. Вершы. Паэмы. П’есы / Я. Купала. – Мінск: Харвест, 2007. – 703 с.
2. Колас, Я. Збор твораў: У 14 т. Т. 1. / Я. Колас. – Мінск: Дзяржвыдавецтва БССР, 1972. – 562 с.
3. Броўка, П. Крыніца з-пад Вушачы: вершы і паэмы / П. Броўка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2003. – 366 с.
4. Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва: выбраная лірыка / М. Танк. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2003. – 479 с.
5. Пысін, А. Збор твораў: у 2 т. Т. 1: Вершы / А. Пысін. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1989. – 399 с.
6. Куляшоў А. Паміж наступным і былым: Вершы, паэмы / А. Куляшоў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1995. – 542 с.